CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

| | |
|---|---|
| *Rodzaj dokumentu:* | **Aneks do**<br>**Komunikatu dyrektora Centralnej Komisji Egzaminacyjnej z 1 września 2021 r. w sprawie listy jawnych zadań w części ustnej egzaminu maturalnego z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej w roku 2023** |
| *Egzamin:* | **Egzamin maturalny** |
| *Przedmiot:* | **Język białoruski**, część ustna |
| *Termin egzaminu:* | Termin główny – **maj 2023 r.**<br>Termin dodatkowy – **czerwiec 2023 r.**<br>Termin poprawkowy – **sierpień 2023 r.** |
| *Data publikacji dokumentu:* | 13 czerwca 2022 r.<br>(aktualizacja: 26 sierpnia 2022 r.) |

Na podstawie art. 11 ust. 6 ustawy z dnia 12 maja 2022 r. o zmianie ustawy o systemie oświaty oraz niektórych innych ustaw[1] w ***Komunikacie dyrektora Centralnej Komisji Egzaminacyjnej z 1 września 2021 r. w sprawie listy jawnych zadań w części ustnej egzaminu maturalnego z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej w roku 2023***[2] wprowadza się następujące zmiany: zadania dotyczące lektur obowiązkowych nieujętych w wymaganiach egzaminacyjnych zostały anulowane – zaznaczono je przekreśleniem.

Na podstawie art. 9a ust. 2 pkt 10 lit. a tiret piąte ustawy z dnia 7 września 1991 r. o systemie oświaty[3] oraz § 6 ust. 2 rozporządzenia Ministra Edukacji i Nauki z dnia 26 lutego 2021 r. w sprawie egzaminu maturalnego[4] ogłaszam listę jawnych zadań w części ustnej **egzaminu maturalnego z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej** obowiązującą w **roku 2023**.[5]

1. „Біблія дзецям і людзям простым – кніга для навучання, настаўнікам і людзям мудрым – для захаплення”. Паразважай над тэмай. Звярніся да ***Прадмовы да ўсёй Біблії*** Францыска Скарыны і адвольнага літаратурнага твора.
2. Што такое нацыянальныя каштоўнасці? Адкажы на пытанне, спасылаючыся на апавяданне ***Плачка*** Яна Баршчэўскага і адвольны літаратурны твор.
3. Вобразы простых людзей у літаратуры. Прадстаў тэму, спасылаючыся на паэму ***Тарас на Парнасе*** Канстанціна Вераніцына і адвольны літаратурны твор.
4. Старонкі нацыянальнай гісторыі ў літаратуры. Прадстаў тэму, звяртаючыся да ***Пісьмаў з-пад шыбеніцы*** Кастуся Каліноўскага і адвольнага літаратурнага твора.
5. З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў можа ствараццa камічны эфект? Паразважай над пытаннем на падставе п’есы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ***Пінская шляхта*** і адвольнага літаратурнага твора.
6. Роля сацыяльнай сатыры ў тэкстах культуры. Паразважай над праблемай, спасылаючыся на фарс-вадэвіль ***Пінская шляхта*** Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і адвольны літаратурны твор.
7. Якую ролю ў мастацкай літаратуры адыгрывае камізм? Паразважай над праблемай, спасылаючыся на твор Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ***Пінская шляхта*** і адвольны літаратурны твор.
8. Ці варта змагацца за сваё каханне? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на фарс-вадэвіль Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ***Пінская шляхта*** і адвольны літаратурны твор.

---

[1] Dz.U. 2022, poz. 1116.
[2] Dokument jest dostępny pod adresem: https://cke.gov.pl/images/_EGZAMIN_MATURALNY_OD_2023/komunikaty/EM%20Komunikat%20o%20egzaminie%20ustnym%20z%20j%C4%99zyka%20bia%C5%82oruskiego_Formu%C5%82a%202023.pdf
[3] Dz.U. z 2020 r. poz. 1327, z późn. zm.
[4] Dz.U. poz. 482.
[5] Szczegółowy opis części ustnej egzaminu maturalnego z języka białoruskiego od roku szkolnego 2022/2023 (dla absolwentów 4-letniego liceum ogólnokształcącego oraz 5-letniego technikum) jest dostępny w *Informatorze o egzaminie maturalnym z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej*. Niniejsza lista zadań jawnych określa **wyłącznie** zakres wiadomości i umiejętności sprawdzanych w pierwszym zadaniu w zestawie egzaminacyjnym, który zdający będzie losował podczas części ustnej egzaminu maturalnego z języka białoruskiego w 2023 r. Niniejsza lista **nie wyczerpuje jednak** tematyki omawianej w zakresie każdej z lektur obowiązkowych. Lista ta **nie stanowi również** wytycznych dla nauczycieli określających wyłączną tematykę, która powinna być poruszana podczas zajęć. Znajomość problematyki lektur obowiązkowych sprawdzana będzie również w części pisemnej egzaminu maturalnego z języka białoruskiego, także w zakresie, którego nie obejmuje niniejszy *Komunikat*.

9. Чаму родная мова – вялікі скарб для народа? Паразважай над пытаннем, звяртаючыся да ***Прадмовы да “Дудкі беларускай”*** Францішка Багушэвіча і адвольнага літаратурнага твора.
10. Кантрасты ў літаратуры. Прадстаў тэму. Звярніся да верша Францішка Багушэвіча ***Калыханка*** і адвольнага літаратурнага твора.

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі;
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці...
Сядзе матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Памілуе, пажалуе;
Пачастуе мядком сытным,
Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай гарачынкай...
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, то будзе рада матка,
Хоць і простая салдатка,
А ўсякі шапку здыме,
Як дазнаецца аб сыне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў Божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад Бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Тагды матка прыйдзе ў госці,
Сын выкіне стары косці,
Жабруючы, пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць Матку Боску,
Каб забыцца ей аб сыне,
Каб не ведаць, гдзе ён згіне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.

Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі.
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі...

Францішак Багушэвіч, *Калыханка*, www.knihi.com

11. Матыў вырачэння бацькоў у літаратуры. Прадстаў тэму, звяртаючыся да апавядання ***На Каляды к сыну*** Змітрака Бядулі і адвольнага літаратурнага твора.
12. Што адчувае чалавек, сустрэўшыся з няўдзячнасцю? Паразважай над пытаннем, звяртаючыся да апавядання ***На Каляды к сыну*** Змітрака Бядулі і адвольнага літаратурнага твора.
13. Партрэты старасці ў літаратуры. Паразважай над тэмай, звяртаючыся да апавядання ***На Каляды к сыну*** Змітрака Бядулі і адвольнага літаратурнага твора.
14. Што значыць быць сумленным чалавекам? Паразважай над пытаннем на падставе апавядання ***На Каляды к сыну*** Змітрака Бядулі і адвольнага літаратурнага твора.
15. Што такое шчасце? Паразважай над пытаннем на падставе апавядання Змітрака Бядулі ***Пяць лыжак заціркі*** і адвольнага літаратурнага твора.
16. Вобразы беднасці ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне ***Пяць лыжак заціркі*** Змітрака Бядулі і адвольны літаратурны твор.
17. Сацыяльныя праблемы ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне ***Пяць лыжак заціркі*** Змітрака Бядулі і адвольны літаратурны твор.
18. Як у тэкстах культуры прадстаўлены рысы нацыянальнага характару беларусаў? Паразважай над пытаннем на падставе апавядання ***Пяць лыжак заціркі*** Змітрака Бядулі і адвольнага літаратурнага твора.
19. Этыкет беларусаў у мастацкіх творах. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне ***Пяць лыжак заціркі*** Змітрака Бядулі і адвольны літаратурны твор.
20. Як трэба ставіцца да роднай мовы? Паразважай над пытаннем. Звярніся да адозвы Цёткі ***Шануйце роднае слова!*** і адвольнага літаратурнага твора.
21. Якое значэнне мае родная мова ў жыцці чалавека і народа? Паразважай над пытаннем. Звярніся да адозвы Цёткі ***Шануйце роднае слова!*** і адвольнага літаратурнага твора.
22. Навошта людзям мастацтва? Адкажы на пытанне на падставе ***Апокрыфа*** Максіма Багдановіча і адвольнага літаратурнага твора.
23. Праблемы беларускай нацыі XX стагоддзя ў тэкстах культуры. Прадстаў тэму на падставе эсэ Максіма Багдановіча ***Хто мы такія?*** і адвольнага літаратурнага твора.

24. Чым актуальнае ў наш час паняцце нацыянальнага адраджэння? Паразважай над пытаннем на падставе ***Санета*** Максіма Багдановіча і адвольнага літаратурнага твора.

Ахвярую А. Погодіну

Un sonnet sans défaut
vaut seul un long poème.
Boileau

Беззаганны санет
варты адзін цэлае паэмы.
Буало (фр.)

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршчку насення жменю там знайшлі.

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.
Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я веру, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

Максім Багдановіч, *Санет*, www.knihi.com

25. Што можа зрабіць вайна з чалавекам? Паразважай над пытаннем на падставе апавядання Максіма Гарэцкага ***Рускі*** і адвольнага літаратурнага твора.
26. Чалавек у крытычнай сітуацыі. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне Максіма Гарэцкага ***Рускі*** і адвольны літаратурны твор.
27. Якую функцыю ў мастацкіх творах выконваюць фальклорныя элементы? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на паэму Янкі Купалы ***Курган*** і адвольны літаратурны твор.
28. Ці варта адстойваць свае каштоўнасці? Паразважай над пытаннем на падставе паэмы ***Курган*** Янкі Купалы і адвольнага літаратурнага твора.
29. Канфлікты простых людзей з уладай у тэкстах культуры. Паразважай над тэмай на падставе паэмы ***Курган*** Янкі Купалы і адвольнага літаратурнага твора.
30. Матыў песняра ў тэкстах культуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на паэму ***Курган*** Янкі Купалы і адвольны літаратурны твор.
31. Чаму павінна служыць мастацтва – праўдзе ці грашам? Адкажы на пытанне, абапіраючыся на паэму Янкі Купалы ***Курган*** і адвольны літаратурны твор.
32. Паэт і паэзія ў тэкстах культуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на паэму ***Курган*** Янкі Купалы і адвольны літаратурны твор.

33. Важныя падзеі з гісторыі беларусаў у тэкстах культуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на артыкул ***Незалежнасць*** Янкі Купалы і адвольны літаратурны твор.
34. Навошта народам незалежнасць? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на артыкул ***Незалежнасць*** Янкі Купалы і адвольны літаратурны твор.
35. Як у тэкстах культуры можа быць прадстаўлена каханне? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на верш Янкі Купалы ***Явар і каліна*** і адвольны літаратурны твор.

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай:
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым.

Захадам модлы пакорныя
З маткай-зямлёй адпраўляюць;
Тайна у ночаньку чорную
Месяца, зор выглядаюць.

Слухаюць смехаў русалчыных,
Лопату крылляў начніцы,
Ветру павеваў ап’янчаных,
Плюскату шклістай крыніцы.

Чуецца музыка дзіўная
Ў повесцях сонных імшараў...
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

Янка Купала, *Явар і каліна*, www.knihi.com

36. З чаго складаецца культурная спадчына? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на верш Янкі Купалы ***Спадчына*** і адвольны літаратурны твор.

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пасьбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладзьбішчы.

І ў белы дзень, і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з'едзены.

Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

Янка Купала, *Спадчына*, www.knihi.com

37. Чаму сяброўства – гэта каштоўнасць? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на апавяданне Якуба Коласа ***Што яны страцілі?*** і адвольны літаратурны твор.
38. Што чалавеку патрэбна для шчасця? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на апавяданне Якуба Коласа ***Што яны страцілі?*** і адвольны літаратурны твор.
39. Якую функцыю могуць выконваць апісанні прыроды ў тэкстах культуры? Адкажы на пытанне, звяртаючыся да паэмы ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольнага літаратурнага твора.
40. Як у тэкстах культуры бывае прадстаўлены горад? Адкажы на пытанне, звяртаючыся да паэмы ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольнага літаратурнага твора.
41. Якое значэнне ў жыцці чалавека маюць святы? Адкажы на пытанне, звяртаючыся да паэмы ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольнага літаратурнага твора.
42. У чым заключаецца пачуццё годнасці? Адкажы на пытанне, звяртаючыся да паэмы ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольнага літаратурнага твора.
43. Як у тэкстах культуры бывае прадстаўлена штодзённасць? Адкажы на пытанне, звяртаючыся да паэмы ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольнага літаратурнага твора.
44. Што матывуе чалавека добра рабіць сваю працу? Адкажы на пытанне, звяртаючыся да паэмы ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольнага літаратурнага твора.

45. Селянін як носьбіт беларускай культуры. Прадстаў тэму, спасылаючыся на паэму ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольны літаратурны твор.
46. Як мастакі слова адлюстроўвалі жыццё сялян у тэкстах культуры? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на паэму ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольны літаратурны твор.
47. Чалавек – частка прыроды. Прадстаў тэму, спасылаючыся на паэму ***Новая зямля*** Якуба Коласа і адвольны літаратурны твор.
48. Маральнае аблічча чалавека на фоне гістарычных перамен. Паразважай над тэмай, спасылаючыся на апавяданне Кузьмы Чорнага ***Макаркавых Волька*** і адвольны літаратурны твор.
49. Ці прыносіць помста шчасце? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на апавяданне Кузьмы Чорнага ***Макаркавых Волька*** і адвольны літаратурны твор.
50. Маральныя дылемы ў літаратуры. Паразважай над тэмай, абапіраючыся на апавяданне Кузьмы Чорнага ***Макаркавых Волька*** і адвольны літаратурны твор.
51. Чаму тэме любові да Радзімы прысвечана так шмат мастацкіх твораў? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на верш Наталлі Арсенневай ***Малітва*** і адвольны літаратурны твор.

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхай і ветлай
рассып праменне Свае хвалы.
Дай спор у працы будзённай, шэрай,
на хлеб штадзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласць – дай!
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу і наш народ!

Наталля Арсеннева, *Малітва*, [у:] Б. Сачанка, *Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі*, Мінск 1992, с. 88.

52. ~~Вобраз маці ў літаратуры. Прадстаў тэму на падставе верша Максіма Танка ***Рукі маці*** і адвольнага літаратурнага твора.~~

Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі, дажджамі
Іх цалавала.
Пража нямала
З іх выпіла ў ночы бяссонныя
Свежасці ранняй.
Колькі яны запалілі світанняў,
Зораў над намі.

Колькі сягоння на іх
Віднеецца чорных, глыбокіх
Шрамоў і маршчынаў,
Гэта сляды, што навекі пакінуў
Шлях наш суровы.
Толькі заўсёды,
Як мы зберымося дамоў
І на стол пакладзе рукі маці,
Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце
І ў сэрцы.

Максім Танк, *Рукі маці*, www.maksimtank.ru

53. Роля паэта ў цяперашнім свеце. Паразважай над тэмай. Звярніся да верша Ларысы Геніюш ***Маці мая сялянская*** і адвольнага літаратурнага твора.

***
Маці мая сялянская,
маці мая славянская,
ветлівая, гасцінная,
ў крыўдзе чужой
непавінная.
Ураджайная і зялёная,
хлебам слаўная ад вякоў,
неспакойная, неўгамонная
ды бунтарская ў жылах кроў.

Гаспадарыла
ды батрачыла –
намагалася за дваіх.
Не хачу я чужое
мачыхі
аглядаць
на слядох тваіх!

Ты мой боль круты,
ты мой шлях святы,
сцежка верная ў цішыне.
Ўсё мне дарага,
што прыдбала ты
працай, сілаю
для мяне.

Ты – як праўда праўд,
ўсюды свой і брат,
мовы роднае
звонкі дар,
Ты мой шлях круты,
ты мой боль святы,

Беларусь мая,
мой алтар.

[1966]

Ларыса Генію́ш, *Маці мая сялянская*, www.rv-blr.com

54. У чым заключаецца геройства? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на апавяданне Янкі Брыля ***Маці*** і адвольны літаратурны твор.
55. Гераічныя ўчынкі жанчын у літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання Янкі Брыля ***Маці*** і адвольнага літаратурнага твора.
56. Што такое прыгажосць? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на апавяданне ***Слепата*** Яна Скрыгана і адвольны літаратурны твор.
57. Жанчына і вайна. Паразважай над тэмай, спасылаючыся на апавяданне ***Слепата*** Яна Скрыгана і адвольны літаратурны твор.
58. Вобразы дзяцей у літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Дзеці настаўніцы*** Івана Шамякіна і адвольнага літаратурнага твора.
59. Вобраз ба́цькі ў літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Дзеці настаўніцы*** Івана Шамякіна і адвольнага літаратурнага твора.
60. Якое значэнне маюць традыцыйныя абрады ў жыцці беларусаў? Адкажы на пытанне на падставе вядомых табе фрагментаў рамана ***Людзі на балоце*** Івана Мележа і адвольнага літаратурнага твора.
61. Адносіны дзяцей і бацькоў у літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Чаравікі-туфелькі*** Барыса Сачанкі і адвольнага літаратурнага твора.
62. Як бывае прадстаўлена моладзь у тэкстах культуры? Адкажы на пытанне, абапіраючыся на апавяданне ***Чаравікі-туфелькі*** Барыса Сачанкі і адвольны літаратурны твор.
63. Што ўплывае на тое, што розныя людзі маюць розныя каштоўнасці? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на апавяданне ***Чаравікі-туфелькі*** Барыса Сачанкі і адвольны літаратурны твор.
64. У чым заключаецца канфлікт пакаленняў? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на апавяданне Барыса Сачанкі ***Чаравікі-туфелькі*** і адвольны літаратурны твор.
65. Маладыя людзі на вайне. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне ***Дарога праз лес*** Барыса Сачанкі і адвольны літаратурны твор.
66. Гісторыі кахання ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне ***Дарога праз лес*** Барыса Сачанкі і адвольны літаратурны твор.
67. Партрэты беларусаў у літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты кнігі ***Зямля пад белымі крыламі*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
68. Адносіны чалавека і прыроды ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты кнігі ***Зямля пад белымі крыламі*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
69. Навошта трэба берагчы прыроду? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты кнігі ***Зямля пад белымі крыламі*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
70. Матыў здрады ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты аповесці ***Дзікае паляванне караля Стаха*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.

71. Адмоўныя героі ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты аповесці ***Дзікае паляванне караля Стаха*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
72. Чаму вернасць – гэта ўніверсальная каштоўнасць? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты аповесці ***Дзікае паляванне караля Стаха*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
73. Якія чалавечыя заганы нельга даравацьʼ? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты аповесці ***Дзікае паляванне караля Стаха*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
74. Матыў помсты ў літаратуры. Паразважай над тэмай, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты аповесці ***Дзікае паляванне караля Стаха*** Уладзіміра Караткевіча і адвольны літаратурны твор.
75. Што любоў да Радзімы дае чалавеку? Паразважай над пытаннем. Звярніся да верша Уладзіміра Караткевіча ***„На Беларусі Бог жыве”*** і адвольнага літаратурнага твора.

„На Беларусі Бог жыве”, –
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль,
І продкаў запавет,
І мовы залатая сталь,
І нашых дум сусвет.
Тую праўду сцвярджае
Ўсё зноў і зноў
Ўсім лёсам –
Няхай спакваля, –
У хмарах дубоў,
У вясёлках агнёў
Купальская наша зямля.
І няхай давядзе мне
Іншая кроў,
Што брашу,
Як сабачы сын, –
А няма нідзе
Вярнейшых сяброў
І прыгажэйшых жанчын.
Гэта край раскрытых душ і дзвярэй,
Гэты край –
Твой дом і сабор...
Ў нас дваццаць з лішнім тысяч рэк,
Адзінаццаць тысяч азёр.
Нам ёсць што піць,
З падмосткаў ліць,
Чым палі свае акрапіць,
А як давядзе, то ёсць нам дзе

І ворага ўтапіць.
І тая памяць жыве не ў царкве,
А ў кожнай жыве галаве:
„На Беларусі Бог жыве...” –
І хай сабе жыве.
А калі ён шле на нас кару і гнеў –
Ну што ж, мы з ім свае:
Ў вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б'е.

У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў
Маланка ніколі не б'е.

І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
„На Беларусі Бог жыве”, –
І няхай да веку жыве.

Уладзімір Караткевіч, *На Беларусі Бог жыве*, www.knihi.com

76. Што самае важнае ў жыцці? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на мініяцюру ***Гасцінец*** Сакрата Яновіча і адвольны літаратурны твор.
77. Матыў смерці ў літаратуры. Паразважай над тэмай, абапіраючыся на мініяцюру ***Гасцінец*** Сакрата Яновіча і адвольны літаратурны твор.
78. У чым заключаецца бацькоўская любоў? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на апавяданне ***Бацькаў гнеў*** Сакрата Яновіча і адвольны літаратурны твор.
79. Вобразы бацькоў у літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Бацькаў гнеў*** Сакрата Яновіча і адвольнага літаратурнага твора.
80. Матыў самаахвярнасці ў літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Бацькаў гнеў*** Сакрата Яновіча і адвольнага літаратурнага твора.

81. Ці можна пражыць жыццё без любові? Паразважай над пытаннем на падставе верша ***Ты пакліч мяне. Пазаві…*** Яўгеніі Янішчыц і адвольнага літаратурнага твора.

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі
І змяняюцца краявіды,
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві…*, www.rv-blr.com

82. Навошта чалавеку надзея? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты п’есы ***Вечар*** Аляксея Дударава і адвольны літаратурны твор.
83. Матыў старасці ў літаратуры. Прадстаў тэму, абапіраючыся на вядомыя табе фрагменты п’есы ***Вечар*** Аляксея Дударава і адвольны літаратурны твор.
84. Дэгуманізацыя чалавека – вынік уздзеяння знешніх фактараў ці віна асобы? Паразважай над праблемай, спасылаючыся на твор Васіля Быкава ***Аблава*** і адвольны літаратурны твор.
85. Ці варта рабіць дабро? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на твор Васіля Быкава ***Аблава*** і адвольны літаратурны твор.
86. Як героя характарызуе яго мова? Паразважай над пытаннем, спасылаючыся на аповесць Васіля Быкава ***Аблава*** і адвольны літаратурны твор.
87. Свет прыроды і свет людзей: падабенства і адрозненні. Паразважай над тэмай на падставе аповесці Васіля Быкава ***Аблава*** і адвольнага літаратурнага твора.
88. Нялюдскае аблічча вайны. Прадстаў тэму, абапіраючыся на апавяданне ***Калі хочацца жыць*** Васіля Быкава і адвольны літаратурны твор.
89. Вобразы маладых людзей у літаратуры. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Калі хочацца жыць*** Васіля Быкава і адвольнага літаратурнага твора.
90. Жыццё як універсальная каштоўнасць. Прадстаў тэму на падставе апавядання ***Калі хочацца жыць*** Васіля Быкава і адвольнага літаратурнага твора.

91. Што для чалавека значыць Радзіма? Паразважай над пытаннем. Звярніся да верша Алеся Барскага ***Беластоцкі край*** і адвольнага літаратурнага твора.

Мой Беластоцкі край – мая Айчына!
З табою звязаны мой лёс і доля.
Люблю лясы твае, люблю даліны,
Кахаю шчыра бацькаўскае поле.

Калышашся ў напевах песні роднай
І мыеш твар у промнях залацістых,
І толькі тут я поўнасцю свабодны,
І толькі тут душой заўсёды чысты.

Сямяцічы і Гайнаўка, і Бельск старынны,
Саколка ціхая, зялёная Дуброва,
Любоў да вас – мая адвечная павіннасць
І вернасць матчынай спрадвечнай мове.

Шасціць калоссе у палях шырокіх,
Бурліць крыніца песняю адвечнай,
Звініць нядзельны звон з царквы далёкай, –
На роднай Беласточчыне я вечны.

Зямля мая, мой беларускі краю,
Над Нарваю, над Бугам задуменным
Я вольны тут, душой адпачываю,
Мой краю вечны, краю незаменны.

Алесь Барскі, *Беластоцкі край*, [у:] А. Барскі, *Выбраныя творы*, Мінск 2011, с. 21.



CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

92. У чым заключаецца сувязь чалавека з месцам, дзе ён нарадзіўся? Паразважай над пытаннем на падставе верша ***Я сын зямлі беластоцкай…*** Алеся Барскага і адвольнага літаратурнага твора.

***
Я сын зямлі беластоцкай,
і іншай мне маці не трэба,
там сосны высока-высокія
ад зямлі да блакітнага неба.
Там рэчкі сінія-сінія
і ветры з далонямі кволымі
бягуць па зялёнай краіне,
як сябры заўсёды вясёлыя.
Там сонца прыходзіць у дрэвы,
і дрэвы да сонца імкнуцца,
і вабіць краіна нас спевам,
і просіць і просіць вярнуцца.

Алесь Барскі, *Я сын зямлі беластоцкай…*, [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Białystok 2013, с. 52.

93. Ці павінен чалавек берагчы памяць аб сваёй Малой Айчыне? Паразважай над пытаннем. Звярніся да верша Алеся Барскага ***Беластоцкі край*** і адвольнага літаратурнага твора.

Мой Беластоцкі край – мая Айчына!
З табою звязаны мой лёс і доля.
Люблю лясы твае, люблю даліны,
Кахаю шчыра бацькаўскае поле.

Калышашся ў напевах песні роднай
І мыеш твар у промнях залацістых,
І толькі тут я поўнасцю свабодны,
І толькі тут душой заўсёды чысты.

Сямяцічы і Гайнаўка, і Бельск старынны,
Саколка ціхая, зялёная Дуброва,
Любоў да вас – мая адвечная павіннасць
І вернасць матчынай спрадвечнай мове.

Шасціць калоссе у палях шырокіх,
Бурліць крыніца песняю адвечнай,
Звініць нядзельны звон з царквы далёкай, –
На роднай Беласточчыне я вечны.

Зямля мая, мой беларускі краю,
Над Нарваю, над Бугам задуменным
Я вольны тут, душой адпачываю,

Мой краю вечны, краю незаменны.

Алесь Барскі, *Беластоцкі край*, [у:] А. Барскі, *Выбраныя творы*, Мінск 2011, с. 21.

94. ~~Развагі над сэнсам жыцця ў літаратуры. Прадстаў тэму на падставе верша ***Праводзіла з дому…*** Уладзіміра Някляева і адвольнага літаратурнага твора.~~

Праводзіла з дому...
На ўзмежку бацькоўскага поля:
“Сынок мой, – сказала, –
які ж мне наказ табе даць?
Ніколі не збочваць з дарогі –
зайздросная доля.
Ды хай не міне цябе доля
дарогу губляць.
Хай зведаеш ты
Нежалобную долю блуканняў,
Хай знойдзеш – і знішчыш,
Хай дойдзеш – і кінешся прэч,
Спазнаеш
Сустрэчу
У час спусташальных расстанняў,
Спазнаеш
Расстанне
У час невыносных сустрэч.

Хай страціш ты многа,
Каб долі сапраўднай не страціць”.

Ён жыў гэтай доляй.
Кахаў.
Расставаўся.
Блукаў.
Дадому вярнуўся:
„Сынок мой, – спыталася маці, –
Знайшоў ты ці страціў?..”

Заплакаў –
І ў ногі
Упаў.

Уладзімір Някляеў, *Праводзіла з дому…*, www.rv-blr.com

95. ~~Як у тэкстах культуры выяўляюць маці? Прадстаў тэму на падставе верша ***Праводзіла з дому…*** Уладзіміра Някляева і адвольнага літаратурнага твора.~~

Праводзіла з дому...
На ўзмежку бацькоўскага поля:
„Сынок мой, – сказала, –
які ж мне наказ табе даць?
Ніколі не збочваць з дарогі –
зайздросная доля.
Ды хай не міне цябе доля



CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

дарогу губляць.

Хай зведаеш ты
Нежалобную долю блуканняў,
Хай знойдзеш – і знішчыш,
Хай дойдзеш – і кінешся прэч,
Спазнаеш
Сустрэчу
У час спусташальных расстанняў,
Спазнаеш
Расстанне
У час невыносных сустрэч.

Хай страціш ты многа,
Каб долі сапраўднай не страціць".

Ён жыў гэтай доляй.
Кахаў.
Расставаўся.
Блукаў.
Дадому вярнуўся:
„Сынок мой, – спыталася маці, –
Знайшоў ты ці страціў?.."

Заплакаў –
І ў ногі
Упаў.

Уладзімір Някляеў, *Праводзіла з дому…*, www.rv-blr.com

96. Экалагічныя катастрофы і іх асэнсаванне ў тэкстах культуры. Паразважай над тэмай на падставе вядомых табе фрагментаў кнігі Святланы Алексіевіч ***Чарнобыльская малітва*** і адвольнага літаратурнага твора.
97. Чарнобыльская катастрофа – гэта надалей пагроза ці даўняе мінулае? Паразважай над пытаннем на падставе вядомых табе фрагментаў кнігі Святланы Алексіевіч ***Чарнобыльская малітва*** і адвольнага літаратурнага твора.
98. Трагічнае каханне ў літаратуры. Прадстаў тэму на падставе вядомых табе фрагментаў кнігі Святланы Алексіевіч ***Чарнобыльская малітва*** і адвольнага літаратурнага твора.
99. Беларускія нацыянальныя сімвалы. Прадстаў тэму на падставе вядомых табе фрагментаў кнігі Барыса Пятровіча ***Спачатку была цемра*** і адвольнага літаратурнага твора.
100. Чаму важна ведаць гісторыю свайго народа? Адкажы на пытанне на падставе вядомых табе фрагментаў кнігі Барыса Пятровіча ***Спачатку была цемра*** і адвольнага літаратурнага твора.

CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA
DYREKTOR
dr Marcin Smolik